**Білет 16**

**Практычнае заданне.**

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі і іх значэнне.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Як называўся план нападу фашысцкай Германіі на СССР?
2. Каля якога населеннага пункта ўлетку 1941 года Чырвоная Армія нанесла танкавы контрудар па германскіх войсках? Пакажыце гэта месца на картасхеме.
3. Якая форма масавага патрыятычнага руху савецкіх людзей праявілася пры абароне Магілёва і Гомеля?
4. У заходняй літаратуры асноўнымі прычынамі краху гітлераўскага плана «маланкавай вайны» называюць неспрыяльныя кліматычныя ўмовы і вялізныя тэрыторыі СССР. А якія прычыны правалу гітлераўскага плана «маланкавай вайны» назвалі б вы? Якое стратэгічнае значэнне, на вашу думку, мелі абарончыя баі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г.? Свой адказ растлумачце.

**I. З Дырэктывы № 21 Вярхоўнага камандавання ўзброенымі сіламі Германіі (план «Барбароса»).** *18 снежня 1940 г.*

«Германскія ўзброеныя сілы павінны быць гатовы разбіць Савецкую Расію падчас кароткачасовай кампаніі <…>.

Асноўныя сілы рускіх сухапутных войскаў, якія знаходзяцца ў Заходняй Расіі, павінны быць знішчаны ў смелых аперацыях з дапамогай глыбокага, хуткага вылучэння танкавых клінаў. Адступленне баяздольных войскаў праціўніка на шырокія прасторы рускай тэрыторыі павінна быць прадухілена.

… Кірунак галоўнага ўдару павінен быць на поўнач ад Прыпяцкіх балот. Тут трэба засяродзіць дзве групы армій. ...На поўначы – хутка выйсці да Масквы. Захоп гэтага горада азначае вырашальны поспех…».

**II. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»)*

Германскае камандаванне рабіла стаўку на стратэгію «бліцкрыгу» («маланкавай вайны»), якая цалкам апраўдала сябе ў вайне на Захадзе. У ходзе рэалізацыі плана «Барбароса» германскі вермахт планаваў да 15 жніўня дасягнуць Масквы і авалодаць Данецкім басейнам, а да 1 кастрычніка 1941 г. завяршыць ваенную аперацыю супраць СССР.

... Каб стрымаць наступленне праціўніка на лініі рэк Заходняя Дзвіна і Днепр, Стаўка прыняла меры па ўмацаванні Заходняга фронту рэзервамі. 6 ліпеня 1941 г. паміж Віцебскам і Оршай адбылася адна з самых буйных танкавых бітваў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З дзвюх бакоў удзельнічала каля 1600 танкаў. За тры дні баёў савецкія механізаваныя карпусы прасунуліся да 40 км. Значныя страты былі нанесены ворагу, зніжана яго ўдарная сіла, замаруджаны тэмп прасоўвання на ўсход. Тым не менш 11 ліпеня 1941 г. немцы захапілі Віцебск.

З 3 па 26 ліпеня 1941 г. ішлі напружаныя баі ў раёне Магілёва, які стойка абаранялі войскі Заходняга фронту і байцы атрадаў народнага апалчэння. Непасрэдную абарону горада вяла 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М. Т. Раманава. Два тыдні яна трымала абарону каля вёскі Буйнічы.

Найбольш жорсткія баі адбываліся 12 ліпеня, у гэты дзень савецкія воіны знішчылі 39 танкаў і адбілі некалькі нападаў праціўніка.

Больш за месяц ішлі баі за Гомель. Горад абаранялі не толькі войскі Цэнтральнага фронту, але і 6700 апалчэнцаў, і каля 3 тыс байцоў знішчальных батальёнаў.

Нягледзячы на ўпартае супраціўленне войскаў Заходняга фронту, да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была захоплена ворагам.

Аднак адчувальныя страты панёс і праціўнік: да 10 ліпеня было знішчана 79058 салдат і афіцэраў, 1061 гармата і мінамёт, 826 самалётаў і 350 танкаў. Групоўка армій «Цэнтр» з канца лета 1941 г. вымушана была прыпыніць наступленне. Гітлераўскі план «Барбароса» стаў даваць збоі.

**III. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня – жнівень 1941 г.**

